ЛИТЕРАТУРА: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПРЫКМЕТЫ РАМАНТЫЗМУ Ў ПАЭЗІІ М.А. БАГДАНОВІЧА І У.Б. ЕЙТСА

Азарава В.В.,
магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Крыклівец А.У., доктар філал. навук, дацэнт

Ключавыя словы: беларуская літаратура, ірландская літаратура, паэзія, рамантызм, нацыянальная культура.

М.А. Багдановіч і У.Б. Ейтс з'яўляюцца яркімі прадстаўнікамі беларускага і ірландскага рамантызму. Творчасць абодвух паэтаў даволі добра даследавана ў нацыянальным літаратуразнаўстве, аднак у кампаратыўным ракурсе амаль не вывучалася. *Мэта* артыкула – вызначыць нацыянальныя прыкметы рамантызму ў паэзіі беларускага і ірландскага аўтараў.

Матэрыял і метады. Матэрылам для даследавання паслужылі вершы М. Багдановіча і У.Б. Ейтса ў перакладзе А. Хадановіча. У рабоце выкарастаны параўнальна-тыпалагічны метад даследавання.

Вынікі і іх абмеркаванне. І Максім Багдановіч, і Уільям Ейтс былі паэтамі, якіх хвалявалі ідэі нацыянальнай самасвядомасці. Каштоўнасная арыентацыя Уільяма Ейтса дэманструе імкненне быць свабодным чалавекам і сапраўдным грамадзянінам сваёй краіны. Максім Багадановіч таксама прызнаецца ў любові да сваёй краіны, звяртаючыся да Радзімы ў наступных радках:

Паломаны жыццём, чакаючы магілы,
Радзімая зямля, прынікнуў я к табе,
І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы,
Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы,
І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе [1, с. 218].

У творах інтымнай лірыкі пісьменнікі параноўваюць чалавека з прыродай свайго роднага краю. Паэты жылі ў розных частках свету, таму прырода адрозніваецца: багдановічаўскія таполі ("*Зразаюць галіны таполі адну за адной*…"), вішні ("*Па-над белым пухам вішняў*…"), белыя бярозы з верша "Зімой"; ейтскія чарот, папараць ("*Дзе дрэмлюць зоркі між чароту*", "*Папараць, і тая плача*" з верша "Скрадзенае дзіця").

Матывы Радзімы увасабляюцца ў творчасці паэтаў праз міфалогію Ірландыі і Беларусі. Апеляцыя да нацыянальнай міфалогіі вельмі характэрная для рамантызму. У Ейтса з ірландскай міфалогіі ўзгаданы

багіня Дана (“*Дзеці багіні Даны ў далоні поруч*” з верша “Неўтаймоўнае племя”), Фэргус і Друід з аднайменнага верша. “Вадзянік”, “Змяіны цар”, лясун з верша “Чуеш гул?..” (“*Гэта сумны, мяркотны лясун*”), русалкі з верша “Над возерам” (“*Ноч шапоча русалкам: “Засніце*””).

Вобраз міфалагічнага жыхара беларускіх азёраў і дрыгвы створаны М. Багдановічам у вершы “Вадзянік”:

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся – сплю на дне рэкі.
Твар травой аблутана, бытцам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтые пяскі.

Над вадой ля берага ціха спіць асока,
Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць,
Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, –
І усё навокала сном адвечным спіць [1, с. 144].

Творчая спадчына М. Багдановіча склалася пасля першай рускай рэвалюцыі, калі адчувальным стаў крызіс грамадскага жыцця. Лірыка беларускага паэта сінтэзіруе прыкметы літаратурных традыцый, пануючых ў Еўропе ў пачатку XX стагоддзя: сімвалізму, імпрэсіянізму, рэалізму. Паэт дэманструе расчараванне ў рэальным жыцці, выкрывае яго супярэчлівасць і драматызм, супрацьпастаўляе рэчаіснасці свой рамантычны ідэал. Гэта мара, якая жыве ў душы героя, з якой ён параўноўвае і сацыяльныя, і асабістыя стасункі.

Творчасць У.Б. Ейтса абапіралася на рамантычныя ідэі, укаранёныя ў гераічныя вобразы нацыянальнай міфалогіі. Ірландскі аўтар у народнай культуры шукаў спецыфічныя рысы з-за жадання падкрэсліць яе адрозненне ад англійскай [2]. Культурная і фальклорна-міфалагічная традыцыя, захоўваючыся ў эстэтычнай і этычнай свядомасці людзей, зрабілася асновай для адчування мастацкай пераемнасці. Страта мовы, разарванасць сувязяў паміж культурнымі і моўнымі традыцыямі сталі прадметам паэтычнага асэнсавання.

Заключэнне. М.А. Багдановіч і У.Б. Ейтс значна паўплывалі на развіццё нацыянальных літаратур сваіх краін. Паэзія абодвух аўтараў атрымала рамантычны накірунак у сувязі з незадаволеннасцю рэальнай рэчаіснасцю і сацыяльнымі зменамі. Аднак і М. Багдановіч, і У.Б. Ейтс прапанавалі творчы падыход да асэнсавання шляху далейшага развіцця – праз вобразы нацыянальнай міфалогіі, праз семантычны паралелізм інтымнай і пейзажнай лірыкі. Аснову паэзіі беларускага і ірландскага аўтараў складае любоў да Радзімы, імкненне да маральна-этычных ідэалаў.

1. Багдановіч, М.А. Збор твораў: у двух тамах. Том 1 / М.А. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968.

2. Шода, М.Ю. Архетып роднай краіны ў міфапаэтыцы Янкі Купалы і Уільяма Батлера Ейтса / М.Ю. Шода // Роднае слова, 2017. – № 7. – С. 1–5.